На ўласныя вочы

Чай для гармоніі

«Пабываць у Кітаі» можна было ўсяго толькі даехаўшы да Мінскай ратушы

У Мінску, на плошчы Свабоды, у першы дзень лета адбылося маштабнае мерапрыемства, мэтай якога было бліжэй пазнаёміць беларусаў з унікальнай культурай Паднябеснай. Форум «Чай для гармоніі свету» арганізаваны Міністэрствам культуры і турызму КНР, Пасольствам Кітая ў Беларусі і Мінгарвыканкамам.

Наўрад ці хтосьці будзе спрачацца, што чай — не проста напой. Гэта цэлы пласт самабытнай культуры, прычым не толькі ў краінах, дзе ён расце, але і практычна паўсюдна, куды яго прывозяць ужо не адно стагоддзе. Напрыклад, дарэвалюцыйная культура чаявання ў Расіі (з самаварам і абаранкамі) або англійскі «файф-о-клок» маюць мала агульнага (акрамя самога чаю, які, зрэшты, і смаку іншага, і заварваецца інакш) з кітайскай чайнай цырымоніяй, і ўсё ж першапачаткова бяруць пачатак ад яе. Савецкая «традыцыя чаявання» на начных кухнях — таксама свайго роду культурны пласт. Сёння, працуючы за камп'ютарам, далёка не ўсе беларусы п'юць каву, многія выбіраюць менавіта чай і паволі піць яго могуць цэлы дзень. Кітайцы, дарэчы, свой аўтэнтычны напой так часта не п'юць: чайная цырымонія патрабуе засяроджвання на працэсе, а проста заварыць пакуначак чаю ў кіпені або ўсыпаць з пачка трохі заваркі ў кубак для краіны з такой няўяўна старажытнай культурай чаявання — напэўна, «не камільфо». Найстаражытнейшы напой, паводле легенды, увёў ва ўжыванне адзін з першых імператараў Кітая Шэнь Нун у трэцім тысячагоддзі да нашай эры. У Еўропе ж чай сталі піць каля 400 гадоў таму. На тэрыторыю сучаснай Беларусі ён пачаў завозіцца з Кітая яшчэ ў XVI стагоддзі, а ў XVII — яго ўжыванне распаўсюдзілася ва ўсіх пластах грамадства.

ДУХОЎНЫ ПАДТЭКСТ

Увогуле, невыпадкова чай удастоены ўласнага свята, нават двух. Міжнародны дзень чаю, згодна з рэзалюцыяй ААН, адзначаецца 21 мая, а ў шэрагу краін Дзень чаю святкуюць яшчэ і 15 снежня. У 2022 годзе «Кітайскія традыцыйныя тэхналогіі прыгатавання чаю і звязаных з імі звычаяў» былі ўключаны ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва ЮНЕСКА. Пасля гэтага чайная культура Кітая, якая сыходзіць каранямі ў глыбокае мінулае, звярнула на сябе ўвагу ўсяго свету, адзначаюць у Пасольстве Кітая ў Беларусі. У Паднябеснай чай увасабляе духоўны падтэкст нацыянальнай культуры, сяброўскія сувязі і мірнае суіснаванне паміж людзьмі, гармонію паміж чалавекам і прыродай, а таксама ўзаемаўзбагачэнне культур розных краін, падкрэслілі арганізатары культурнай падзеі.

— Чай выступае пасрэднікам, з дапамогай якога людзі розных этнічных груп і розных народаў маюць магчымасць узаемадзейнічаць і натхняць адзін аднаго, — сказаў, адкрываючы мерапрыемства, **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се СЯАЮН.** — Гэты напой не толькі ўзнімае дух і захоўвае здароўе, а дапамагае зносінам паміж людзьмі. Чаяванне стварае гарманічную атмасферу і ўмацоўвае паразуменне.

Чай у Беларусі любяць не менш, чым у Кітаі, падкрэсліў пасол:

— Гэты напой падобны да моста сяброўства, што цесна злучае Кітай і Беларусь, якія знаходзяцца за тысячы міль. Ідэі гармоніі і інклюзіўнасці, закладзеныя ў традыцыі чаявання, адпавядаюць такім тэндэнцыям эпохі, як адкрытасць, супрацоўніцтва і ўзаемнае культурнае ўзбагачэнне, — рэзюмаваў ён.

Пасол выказаў надзею, што культурнае мерапрыемства «Чай для гармоніі свету», якое ўжо стала добрай традыцыяй, будзе садзейнічаць збліжэнню беларускага і кітайскага народаў на карысць абедзвюх краін. Гэты маляўнічы фестываль праводзіцца ў Мінску ўжо другі раз. Летась беларусы маглі пазнаёміцца з рознымі відамі чаю з кітайскай правінцыі Юньнань, сёлета акцэнт зроблены на культуры і традыцыях аўтаномнага рэгіёна Унутраная Манголія (дзе, дарэчы, розныя віды чаю прынята піць з малаком).

Вельмі важна, што Беларусь і Кітай працуюць не толькі на карысць эканамічных здзяйсненняў, але і для развіцця ведаў аб культуры нашых краін, адзначыла **першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ.**

— Чайная цырымонія — гэта абмен ведамі і культурнымі традыцыямі, магчымасць пагутарыць і вырашыць любыя пытанні мірным шляхам, у згодзе, — дадала яна.

СТАРАЖЫТНЫЯ СТРОІ І ГАРЛАВЫЯ СПЕВЫ

Тыя мінчане і госці сталіцы, хто 1 чэрвеня пабываў на плошчы Свабоды, сапраўды маглі ўбачыць тое, чаго нідзе больш не ўбачыш (ва ўсякім выпадку, для таго каб атрымаць тыя ж уражанні і эмоцыі, прыйшлося б праехаць многія сотні кіламетраў). Разлік арганізатараў быў менавіта на самабытнасць і аўтэнтычнасць шматграннай і шматэтнічнай культуры Кітая. Гэтую ідэю падтрымаў канцэрт калектыву «Улань Муці» з Аўтаномнага раёна Унутраная Манголія. Дарэчы, традыцыйныя касцюмы Унутранай Манголіі (у якіх выступалі артысты) у Кітаі ўключаны ў лік Аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. А творчы калектыў удастоены многіх ганаровых узнагарод у Кітаі (у тым ліку Прэміі Вэньхуа за новы рэпертуар Міністэрства культуры і турызму КНР, Спецыяльнай узнагароды «Прэміі Вэньхуа» Міністэрства культуры і турызму КНР, прэміі Нацыянальнага праекта шэдэўраў выканальніцкага мастацтва за цудоўны рэпертуар, танцавальнай «Прэміі лотас»). Спецыяльна для канцэрта ў Беларусі артысты адабралі тыя нумары, якія лепш за ўсё дэманструюць характар і каларыт іх мясцовасці: старажытныя народныя песні, незвычайную інструментальную музыку і самабытныя танцы. Напрыклад, калектыў прадэманстраваў гледачам знакамітыя мангольскія гарлавыя спевы — асаблівы тып спеваў, пры якім выканаўца здабывае два гукі адначасова: звышнізкі (бас) і звышвысокі (свіст). Звышнізкі тон з'яўляецца апорным, яго вышыня пастаянная, звышвысокі ўтварае мелодыю, вышыня якой змяняецца па жаданні спевака. У выніку атрымліваецца вельмі цікавы эфект. А назвы нумароў, якія гледачы бачылі на сцэне, нібы пераносілі публіку ў далёкую і таямнічую Унутраную Манголію: «Легенда пра прыгажуню Сэньцзідэма», «Сярэбраная чаша», «Ардоскае пачуццё», «Васямнаццаць мелодый флейты», «Рэха Хуанхэ»...

Ну, а пазнаёміцца з усімі дэталямі набору для кітайскай чайнай цырымоніі можна было на пляцоўцы побач з канцэртнай залай «Верхні горад». Камплект маленькіх фарфоравых кубачкаў разнастайнай формы і чайнік тут жа можна было і набыць — у сярэднім рублёў за 70. Як і дзясяткі сартоў чаю. Прадаўцы ахвотна знаёмілі пакупнікоў з відамі чаю і спосабамі іх заваркі.

— Кітайскі чай па смаку значна адрозніваецца ад звыклага нам, — дзеліцца ўражаннямі наведвальніца Алена. Яна расказвае, што трапіла сюды выпадкова — пяцігадовая дачка ўбачыла маляўнічае дзейства і папрасіла маму зайсці паглядзець, што адбываецца.

— Я раней не разумела сяброўак, якія п'юць толькі «сапраўдны кітайскі чай», спецыяльна ездзяць па яго на рынак, — кажа Алена. — Цяпер вось вырашыла пакаштаваць і сама. Мусіць, буду час ад часу купляць зялёны чай кітайскіх сартоў.

Маргарыта, студэнтка МДЛУ, кажа, што яна і яе сяброўкі прыйшлі на імпрэзу мэтанакіравана: цікава было паглядзець этнічную музычную праграму і пакаштаваць сапраўдны кітайскі чай.

— У Беларусі любяць чай, а п'юць яго ў кожнай сям'і па-рознаму, — разважае яна. — Мне, напрыклад, падабаецца ўлетку піць гарачы чорны чай упрыкуску з шакаладным марожаным, лепш за ўсё — з «Каштанам». Толькі важна, каб марожанае, па кантрасце з гарачым чаем, было моцна замарожаным, таму заўсёды спачатку кладу яго хвілін на дзесяць у маразілку. Разумею, што такі перапад тэмператур шкодны для зубной эмалі, але ж смачна!

КАЛІГРАФІЯ І СЯНЦЫ

Тут жа разгарнуў палаткі фестываль кітайскай кухні, дзе можна было пакаштаваць, напрыклад, традыцыйную кітайскую локшыну (вастрыню прапаноўвалася рэгуляваць самастойна — гэтае пытанне кухары ўдакладнялі ў кожнага пакупніка), а таксама стравы Унутранай Манголіі. Кітайская кухня, наогул, на аматара: камусьці занадта востра, камусьці зашмат духмяных зёлак. Але калі ўжо палюбіў яе, то назаўжды, распавёў адзін з тых кухараў, што працавалі на мерапрыемстве:

— Для кітайскай традыцыі характэрна ўменне гатаваць хутка і ў мінімальнай колькасці тлушчу. Так больш карысна і смачна, чым варыць, смажыць або запякаць тыя ці іншыя прадукты доўга, як прынята ў еўрапейскай і, у прыватнасці, у беларускай кухні. Пры мінімальным тэрмічным уздзеянні і мяса, і гародніна захоўваюць свае зыходныя ўласцівасці. Каб страва гатавалася хутка і раўнамерна, усё рэжуць на маленькія кавалачкі. У выніку інгрэдыенты ўбіраюць максімум водараў спецый.

На культурным форуме было шмат майстар-класаў. Іх праводзілі як прадстаўнікі дэлегацыі, што прыехалі непасрэдна на мерапрыемства, так і спецыялісты Кітайскага культурнага цэнтра ў Мінску і чатырох Інстытутаў Канфуцыя (БДУ, МДЛУ, БНТУ, БДУФК). Зразумела, гасцям праекта было прадстаўлена тое, з чым ва ўсім свеце асацыіруецца Паднябесная: каліграфія і традыцыйны кітайскі жывапіс (дзятву вучылі маляваць панду, дарослых — выводзіць пэндзлем іерогліфы). А таксама баявыя мастацтвы. Адкрыў мерапрыемства знакаміты кітайскі танец дракона — старажытнае нацыянальнае відовішча. Фігурай дракона кіруюць каля дзесяці (а часам і больш) чалавек, зладжаныя рухі якіх ствараюць ілюзію, што фігура жывая. Базавыя рухі танца могуць быць знойдзены ў большасці кітайскіх баявых мастацтваў. Дракон традыцыйна сімвалізуе ў Кітаі сілу і годнасць. Акрамя таго, гэтая міфічная істота прыносіць людзям поспех.

Прадставілі на гэтым маляўнічым свяце жыхарам Беларусі госці з Кітая і тыя грані сваёй нацыянальнай культуры, пра якія мы амаль не ведаем: ад традыцыйнага ўсходняга выразання з паперы (у чымсьці падобнага на нашу выцінанку) да гравюр, сярэбраных упрыгажэнняў, вырабаў з кашміру і аўтэнтычных мастацтваў жыхароў рэгіёна Ордас — разьбы па скуры і высокамастацкіх вырабаў з сукна. А яшчэ тут можна было пагуляць у кітайскія шахматы — сянцы. Правілы гульні прапаноўвалася прачытаць у спецыяльнай інструкцыі, якую раздавалі арганізатары майстар-класа. Але знайшоўся сярод наведвальнікаў і чалавек, які выдатна гуляе ў «кітайскія шахматы». Чыёй перамогай скончыўся «паядынак» за шахматнай дошкай паміж кітайскім і беларускім майстрамі сянцы, я не дагледзела — надта вабіў водар ад палатак з ежай. Але гонар за нашых суайчыннікаў адчула: аказваецца, сярод беларусаў ёсць нават людзі, якія ўмеюць гуляць у мудрагелістую ўсходнюю гульню з больш чым двухтысячагадовай гісторыяй, якая, дарэчы, у 2012-м была ўключана ў Сусветныя інтэлектуальныя гульні.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Партнёрства

Ад эканомікі да мастацтва

Прыярытэтныя кірункі магчымага супрацоўніцтва абмеркаваў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай СНАПКОЎ на сустрэчы са старшынёй народнага ўрада кітайскай правінцыі Ляанін Лі Лэчэнам

Сустрэча ва ўрадзе стала працягам трохдзённага візіту кітайскай дэлегацыі ў Беларусь, два першыя дні з якіх яна правяла на Брэсттчыне.

У панядзелак дэлегацыя народнага ўрада правінцыі Ляанін наведала Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ. «Гэта сімвал трапяткіх, глыбокіх, усепагодных адносін паміж нашымі краінамі, сімвал сапраўдных жалезных братоў — Беларусі і Кітая», — лічыць першы віцэ-прэм'ер.

Мікалай Снапкоў канстатаваў, што Беларусь і асабіста Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка не на словах, а на справе актыўна ўдзельнічае ў пабудове Супольнасці адзінага лёсу як рэалізацыі ідэі Старшыні КНР Сі Цзіньпіна. «Упэўнены, што фундаментам і асновай беларуска-кітайскага сяброўства і дружбы лідараў нашых краін з'яўляецца павага да культуры, гісторыі і традыцый, а таксама ідэалогія грамадскай пабудовы. Раўнапраўе і імкненне да агульнай будучыні і сумеснага развіцця таксама з'яўляюцца ідэалогіяй пабудовы нашага грамадства, нашай дзяржаўнасці, як і ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы», — пераканаты ён.

На думку першага віцэ-прэм'ера, шматгадовая дружба Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна дэманструе ўзор палітычнага даверу і ўзаемнай падтрымкі. «Лідары нашых краін пастаянна нацэльваюць нас на работу па актывізацыі і пашырэнні міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Мы спадзяёмся на актыўнае і ўсебаковае развіццё ўзаемадзеяння з правінцыяй Ляанін. З задавальненнем гатовы абмеркаваць з вамі прыярытэтныя кірункі нашага магчымага супрацоўніцтва», — запэўніў Мікалай Снапкоў.

Напярэдадні, падчас наведвання Брэстчыны, адбыліся перагаворы старшыні Брэсцкага аблвыканкама Юрыя Шулейкі і губернатара Народнага ўрада правінцыі Ляанін Лі Лэчэна.

Кіраўнік Брэстчыны пазнаёміў гасцей з асаблівасцямі рэгіёна, расказаў аб эканамічным патэнцыяле, славутасцях Брэстчыны, на першым месцы сярод якіх — легендарная Брэсцкая крэпасць. «Мы адкрыты для эканамічнага, палітычнага, культурнага супрацоўніцтва, — сказаў Юрый Шулейка, — і спадзяёмся на доўгатэрміновыя плённыя стасункі».

У сваю чаргу Лі Лэчэн падзякаваў за цёплы прыём, сказаў, што гасціннасць, добразычлівасць беларусаў ён адчуў з першых гадзін знаходжання на нашай зямлі. Губернатар зрабіў невялікую прэзентацыю свайго рэгіёна, расказаў, што правінцыя Ляанін размешчана на паўночным усходзе Кітая. Насельніцтва складае 42,5 мільёна чалавек. У адным толькі адміністрацыйным цэнтры правінцыі горадзе Шэньяне пражывае больш за 11 мільёнаў чалавек.

Шэньян з'яўляецца буйным цэнтрам авіяцыйнай, ракетна-касмічнай, аўтамабільнай, хімічнай і харчовай прамысловасцяў. У горадзе знаходзіцца штаб-кватэра аднаго з найбуйнейшых кітайскіх распрацоўшчыкаў праграмнага забеспячэння Neusoft Corporation. Сама правінцыя таксама з'яўляецца буйным прамысловым цэнтрам. Асноўныя галіны прамысловасці — хімічная, металургічная, машынабудаўнічая. Напрыклад, па вытворчасці чыгуну і сталі Ляанін займае трэцяе месца ў краіне. Правінцыя багатая запасамі жалезнай руды і вугалю, здабываюць і нафту. Прыродна-кліматычныя ўмовы спрыяюць вырошчванню збожжавых культур, садаводству, жывёлагадоўлі, вытворчасці аквакультур.

Правінцыя мае выхады да Жоўтага мора і Бахайскага заліва. Уздоўж узбярэжжа размешчаны цэлы шэраг партоў, два з якіх уваходзяць у дзясятку найбуйнейшых Кітая. Чыгуначная інфраструктура — адна з найлепшых у краіне. Цяпер у Ляаніне курсіруе ўжо 100 грузавых цягнікоў па маршруце Кітай — Еўропа.

Усяго ў складзе дэлегацыі ў Брэст прыехала каля 80 чалавек. Для зручнасці работы яны падзяліліся на групы. Урадавая група на чале з Лі Лэчэнам сустрэлася са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама. Дэлегацыя горада Далянь пабывала ў Брэсцкім гарвыканкаме, дзе праводзіліся перагаворы на ўзроўні гарадоў. Пазней у аблвыканкаме было падпісана пагадненне аб пабраціміскіх адносінах паміж гарадамі. Свае подпісы паставілі старшыня Брэсцкага гарвыканкама Сяргей Лабадзінскі і віцэ-мэр горада Далянь Лэн Сюэфэнь. Сяргей Лабадзінскі адзначыў, што ў горадзе-пабраціме добра развіваецца турызм, адладжана сістэма гасцінічнага бізнесу: «У нас ёсць зацікаўленасць прыцягнуць інвестара для ўзвядзення гасцініцы, бо з улікам турыстычнага патоку гасцініц, асабліва ў сезон, не хапае».

Прадстаўнікі Ляанінскага ўніверсітэта традыцыйнай кітайскай медыцыны наведалі Цэнтральную гарадскую бальніцу. Быў падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве. Лу Сяадун, сакратар партыйнага камітэта ўніверсітэта, сказала журналістам, што ў перспектыве яна бачыць магчымасці для абмену стажыроўкамі брэсцкіх і кітайскіх медыкаў.

Дзелавыя людзі і прадстаўнікі дэпартамента камерцыі пазнаёміліся з вытворчасцю малочнай прадукцыі ААТ «Савушкін прадукт». Перамовы паміж прадстаўнікамі бізнес-супольнасці прайшлі на пляцоўцы Брэсцкага аддзялення гандлёва-прамысловай палаты.

Яшчэ адна група працавала па праграме культурнага абмену. У Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы была наладжана выстава нематэрыяльнай культурнай спадчыны правінцыі Ляанін, якую ўрачыста адкрылі два губернатары. З правінцыі Ляанін прыехалі таленавітыя майстры. Літаральна на вачах у гледачоў яны стваралі рознымі спосабамі карціны, а таксама вырабы з металу і паперы, здзіўлялі харэаграфічным мастацтвам.

Удзельнікі дэлегацыі наведалі Брэсцкую крэпасць, нацыянальны парк «Белавежская пушча», Косаўскі палацава-паркавы комплекс.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

АМАЛЬ 400 ТЫСЯЧ ШКОЛЬНІКАЎ АЗДАРАВЯЦЦА СЁЛЕТА

Попыт на пуцёўкі павялічваецца

Сёння санаторна-курортны комплекс прадстаўлены 287 установамі, з іх 100 санаторыяў на 28 тысяч месцаў і 187 аздараўленчых арганізацый на 32 тысячы месцаў, а таксама 147 стацыянарных загарадных лагераў на 25 тысяч месцаў, якія будуць працаваць з поўнай нагрузкай у перыяд дзіцячай летняй аздараўленчай кампаніі.

Як адзначыў **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Генадзь БАЛБАТОЎСКІ**, на правядзенне летняй аздараўленчай кампаніі цэнтру выдаткавана больш за 64 мільёны рублёў — дастатковая сума, каб задаволіць усіх ахвотных і тых, хто мае патрэбу ў аздараўленні. Усяго летам прыме юных наведвальнікаў каля шасці тысяч лагераў розных тыпаў. З іх 4,5 тысячы — лагеры з дзённым знаходжаннем, 1,5 тысячы — з кругласутачным.

— Акцэнт будзе рабіцца на павелічэнне долі дзяцей, якія аздараўляюцца ў кругласутачных лагерах, і сёлета мы плануем, што гэта лічба павялічыцца на 10 тысяч дзяцей, — дадаў Генадзь Балбатоўскі.

Попыт на дзіцячыя пуцёўкі ў лагеры штогод павялічваецца. У 2022-м годзе ўпершыню быў дасягнуты рэкордны ахоп, які перавысіў 40 % ад усёй колькасці школьнікаў. Летась гэта лічба перавысіла ўжо 42 %, што ў абсалютных лічбах складае больш за 372 тысячы дзяцей. Сёлета задача яшчэ больш амбіцыйная.

— Як правіла, мы перавыконваем гэтыя планы, бо пастаянна з'яўляюцца ахвотныя. Мяркую, што сёлета наблізімся да 400 тысяч дзяцей, — падзяліўся Генадзь Балбатоўскі. — Усе падрыхтоўчыя работы па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы лагераў выкананы, на іх падрыхтоўку да летняй аздараўленчай кампаніі зрасходавана больш за 30 мільёнаў рублёў. Спадзяюся, што правядзём яе на якасным узроўні.

Права на датацыю

Трэба адзначыць, што, дзякуючы ўнесеным зменам у заканадаўства, з 1 студзеня бягучага года непрацоўныя бацькі таксама маюць права на атрыманне дзяржаўнай датацыі на дзіцячыя пуцёўкі. Для гэтага яны павінны звяртацца да спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, якія працуюць у кожным рэгіёне краіны. Інфармацыя аб адрасе і часе работы ёсць на сайце цэнтра.

Працуючым бацькам, нагадаем, трэба звяртацца з заявай у камісію па аздараўленні па месцы сваёй работы. А вось у прыватныя лагеры дзяржаўная датацыя не выдаткоўваецца.

— Прыватныя лагеры, якія працуюць па ўласнай ініцыятыве, сёлета будуць больш жорстка маніторыцца на прадмет выяўлення месцаў незаконнага знаходжання дзяцей, бо часта там не забяспечана бяспека знаходжання, належныя ўмовы па аказанні паслуг па харчаванні, пражыванні. Удзельная вага парушэнняў у такіх лагерах, якія былі выяўлены летась, складае амаль 90 %. І ў большасці выпадкаў іх прыйшлося закрываць, каб захаваць бяспеку дзяцей. Мы не супраць альтэрнатывы, але з мясцовай выканаўчай уладай павінна быць узгоднена, хто мае права на аказанне гэтых паслуг. Мы не збіраемся нікому нічога забараняць, але ўсё павінна быць законна. Працуем па змене заканадаўства ў дадзеным кірунку, каб рэгламентаваць гэты від дзейнасці, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі.

Традыцыйна летнія канікулы ў Беларусі праводзяць і дзеці з суседніх краін. Летась у нас адпачыла сем тысяч дзяцей, пераважна з Расіі. Сёлета ў суседзяў таксама маецца вялікі попыт на пуцёўкі ў нашых лагерах. Таму дзіцячым установам мэтанакіравана вызвалілі свабодныя месцы, якія яны будуць рэалізоўваць у рамках камерцыйных праектаў.

Аднак найбольш важна аздаравіць тых дзяцей, якія маюць у гэтым асаблівую патрэбу. Летась у летніх лагерах прайшлі аздараўленне больш за пяць тысяч дзяцей-інвалідаў. Там створаны ўсе ўмовы для іх рэабілітацыі. Пераважная большасць дзяцей адпачывае ў такіх лагерах у суправаджэнні бацькоў, пуцёўкі якім, як правіла, аплачваюцца за кошт мясцовых бюджэтаў. Інфармацыя пра наяўнасць такіх месцаў ёсць на сайтах гар- і райвыканкамаў.

Дзеці з чарнобыльскіх зон аздараўляюцца ў беларускіх санаторыях, у тым ліку на чарнаморскім узбярэжжы Расіі.

— Працэнт ахопу дзяцей, што пражываюць на забруджаных тэрыторыях, якія праходзяць аздараўленне, не змяншаецца. Канстатую, што ўсе ахвотныя, хто маюць медыцынскія паказанні, могуць прайсці лячэнне і аздараўленне, — дадаў кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні.

115 рублёў за суткі ў санаторыі

Попыт на беларускія санаторыі ў летнія месяцы асабліва высокі і ўжо не задавальняе патрэбы ўсіх ахвотных. Адначасова расце цікавасць да іх і ў міжсезонне. У першым квартале гэтага года запаўняльнасць у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася і ў сярэднім склала больш за 72,5 %. Колькасць рэалізаваных пуцёвак павялічылася на 6,5 % і склала 277 тысяч, а выручка павялічылася на 30 % і перавысіла 242 мільёны рублёў.

Такая ж тэндэнцыя захоўвалася і па экспарце паслуг. Дынаміка за першы квартал па колькасці замежнікаў, якія наведалі нашы санаторыі, вырасла на 18 %, іх наведала больш за 45 тысяч чалавек. Выручка ад экспарту паслуг перавысіла 34 % і склала 68,5 мільёна рублёў.

У другім квартале сярэдні кошт пуцёўкі складае 102 рублі за суткі ў стандартны двухмесны нумар. Для параўнання: у снежні ён быў у раёне 103,5 рубля. З улікам павышанага попыту на летні перыяд мяркуецца, што цана крыху павялічыцца і будзе на ўзроўні 115-116 рублёў за суткі.

Высокі попыт захоўваецца і ў беларускія санаторыі, якія працуюць на тэрыторыі Расіі. Што датычыцца санаторыяў у Прыбалтыйскіх дзяржавах, то, як паведаміў Генадзь Балбатоўскі, санаторый у латвійскай Юрмале пакуль не прымае пацыентаў, сёння ён на кансервацыі. А санаторый у Друскінінкаі працуе са станоўчым эканамічным вынікам. Ён прымае як грамадзян Еўрасаюза, так і беларусаў: штоквартальна арганізоўваюцца заезды для ўсіх катэгорый грамадзян, але ў прыярытэце дзеці і дзеці-інваліды.

Алена КРАВЕЦ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)